*М.А.БЯСПАЛАЯ*

# ЭВАЛЮЦЫЯ ДЗЯРЖАЎНАЙ КУЛЬТУРНАЙ ПАЛІТЫКІ

Дзяржава пачынае фарміраваць палітыку ў сферы культуры з першых крокаў свайго існавання і, як сведчыць гісторыя, актыўна імкнецца ўплываць на культурнае развіццё. Пад яе кантролем амаль заўсёды знаходзяцца рэлігія, права, эстэтыка, этыка, мастацкая і матэрыяльная культура, нават мова.

Вывучэнню азначанага кірунку дзяржаўнай палітыкі ў розных краінах і ў розныя перыяды прысвячалася шмат навуковых даследаванняў. Асабліва актуальным лічылася вызначэнне аспектаў гэтай праблемы ў савецкі перыяд. Праўда, часцей за ўсё вывучаліся палітыка і роля Камуністычнай партыі ў развіцці пэўных кірункаў культуры ў канкрэтны гістарычны перыяд. Мы не ставім задачай зрабіць гістарыяграфічны агляд па акрэсленай тэме, разумеючы, што гэтаму можа быць прысвечана не адна манаграфія ці дысертацыя.

У сучасных як айчынных, так і замежных даследаваннях па тэорыі культуры, ды і наогул у філасофскай, сацыялагічнай, нават эканамічнай думцы, усё больш трывалыя пазіцыі заваёўваюць ідэі аб выключным значэнні культуры для развіцця кожнай цывілізацыі, грамадства, асобы. Шырокія колы сучаснага грамадства падтрымліваюць думку, што “культура — гэта фундамент, на якім грамадства будуе сваю сістэму каштоўнасцей. Камерцыя і ўрад ёсць вытворчыя, другасныя канструкцыі, залежныя ад культуры, якая забяспечвае кансалідацыю грамадства” [2, с. 41]. Адлюстраваннем навуковых пошукаў па гісторыі і тэорыі культуры на памежжы культуры і сацыяльна-гуманітарных навук стала фарміраванне навуковага кірунку новай дысцыпліны, якая на постсавецкай прасторы вядома пад назвай культуралогіі.

Вяртаючыся да прадмета нашага артыкула, лічым неабходным акрэсліць сферу культурнай палітыкі, якая непарыўна звязана з дзяржаўнымі сацыяльнымі, эканамічнымі і ідэалагічнымі задачамі. Дзяржава распрацоўвае і рэалізуе комплекс тэарэтычных прынцыпаў і практычных мерапрыемстваў, мэтай іх з’яўляецца наданне пэўнага зместу і накіраванасці розным формам культурнай дзейнасці лю- дзей.

Асноўныя задачы культурнай палітыкі рэалізуюцца праз духоўную сферу: мастацтва, адукацыю, навуку — і ў пэўнай ступені ўплываюць на свядомасць людзей, іх погляды, уяўленні, інтарэсы, культурныя традыцыі і звычаі. Безумоўна, гэта вельмі працяглы, складаны працэс з неадназначнымі наступствамі.

Спынім увагу на першым прыкладзе дзяржаўнай рэформы ў духоўнай сферы — прыняцці хрысціянства і хрышчэнні ўсходніх славян у X—XI стст. па візантыйскаму абраду. Як вядома, кіеўскі князь Уладзімір у пачатку 80-х гадоў X ст. спрабаваў умацаваць язычніцтва, надаць яму статус дзяржаўнай рэлігіі. Аднак інтарэсы дзяржавы, якая актыўна фарміравалася і развівалася, патрабавалі тэрміновых і кардынальных змен духоўнай (ідэалагічнай) сферы. Яны сталі прыметнымі пасля прыняцця ў 988 г. хрысціянства і пачатку працэсу хрышчэння ўсходніх славян. Разумеючы, што спадзявацца на хуткую перамогу новай веры над духоўнымі скарбамі, выпрацаванымі многімі пакаленнямі язычнікаў, нельга, улада свядома ўзяла курс на фізічнае знішчэнне носьбітаў язычніцкіх вераванняў і традыцый. І, на наш погляд, мае рацыю К.Тарасаў, калі сцвярджае, што гэтае варварства набыло форму дзяржаўнай палітыкі, стала адной з паліцэйскіх функцый вялікакняжацкай улады [4, с. 28]. Забаранялася старая і ўводзілася новая абраднасць, падлягалі забыццю імёны багоў, разбураліся месцы язычніцкіх малельняў і інш.

Аднак гэтае першае рэвалюцыйнае ўмяшанне дзяржавы ў духоўнае жыццё тагачаснага грамадства выразна паказала, што ствараемая новая культура не можа функцыянаваць без традыцый, што апошнія з’уляюцца галоўнай умовай яе існавання. Вядома, працэс сінтэзу хрысціянства і язычніцтва адбываўся на працягу стагоддзяў і набыў у Беларусі своеасаблівы характар. Як падаецца, мае рацыю нямецкі этнограф В.Манарт, калі гаворыць аб двух узроўнях міфалогіі: вышэйшым (міфы аб багах-героях, касмалогія) і ніжэйшым (абрады, варажба, фальклор). Вышэйшыя міфы выцясняліся хрысціянствам, а ніжэйшыя засталіся ў народзе, паступова прыстасоўваючыся да хрысціянскай тэалогіі. Менавіта так сталася ў духоўным жыцці беларусаў. Народ змог пераасэнсаваць старыя міфы і перанёс іх у новыя ўмовы. Усім вядома спалучэнне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

галоўных язычніцкіх і хрысціянскіх свят і абрадаў. Засталіся ў народнай памяці тыя паганскія багі і духі, якія былі звязаны з паўсядзённымі заняткамі насельніцтва, а не пантэон вышэйшых, якіх падтрымлівала і прапагандавала язычніцкая эліта.

Не патрабуе спецыяльнага доказу той факт, што ўвядзенне хрысціянства садзейнічала актыўнаму развіццю духоўнай і матэрыяльнай культуры ўсходнеславянскіх княстваў, у тым ліку Полацкага і Тураўскага. З'яўленне на нашых землях пісьмовай культуры стымулявала ўзнікненне новых культурных кірункаў, наданне ім хрысціянскага зместу. Дзяржава ў форме княжацкай улады падтрымлівала пашырэнне пісьменнасці і асветы, будаўніцтва права-слаўных храмаў і манастыроў. Не будзем паўтараць вядомыя разважанні аб сімвалічным значэнні ўзвядзення Сафійскага сабора, звернем увагу толькі на асэнсаванне княжацкай уладай важнасці падтрымкі духоўнай культуры.

У той жа час нельга не адзначыць яшчэ адну вельмі важную, на наш погляд, гістарычную акалічнасць, якая ў пэўнай ступені аказала ўплыў на фарміраванне дзяржаўнай пазіцыі ў адносінах да духоўнай сферы. У Візантыйскай імперыі, адкуль да нас прыйшло хрысціянства, нормай з'яўлялася падпарадкаванне духоўнай улады свецкай. Інакш кажучы, уплыў канстанцінопальскага патрыярха быў менш значны, чым імператарская ўлада. На землі ўсходніх славян хрысціянства прыйшло па ініцыятыве княжацкай улады. Пад кантролем апошняй па візантыйскаму прыкладу стваралася царкоўная арганізацыя, залежная ад дзяржавы, ад яе палітычнай і матэрыяльнай падтрымкі.

Прадметам спецыяльнага даследавання можа стаць факт доўгага мірнага суіснавання на адной тэрыторыі язычнікаў-балтаў і хрысціян-славян. Пытанне ў тым, чаму, пражываючы па суседстве, а потым і ў адной дзяржаве, славяне не прыкладалі намаганняў для хрышчэння балтаў, хаця б летапіснай літвы, якая жыла ў поўным славянскім атачэнні. Чаму не былі ахрышчаны лівы, якія плацілі даніну Полацку? Менавіта ў полацкага князя каталіцкія манахі прасілі дазволу на хрышчэнне ліваў і атрымалі яго. Мабыць, нашы продкі не надавалі неабходнай увагі гэтаму фактару культурнай палітыкі? А можа, прычына заключаецца ў тым, што і сярод славян яшчэ было шмат язычнікаў нават у XIV ст.? Адказ на гэта пытанне неадназначны. Некаторыя культуролагі, напрыклад, вылучаюць думку аб асаблівасцях славянскага менталітэту, які характарызуецца міралюбствам і талерантнасцю, і лічаць гэтыя рысы вызначальнымі ў гістарычным развіцці беларусаў. Аднак з усяго сказанага, на наш погляд, найбольш відавочнай можа быць выснова, што пераўтварэнні ў духоўнай сферы адбываюцца на працягу многіх стагоддзяў і значна павольней, чым змены ў палітыцы ці эканоміцы.

Пытанне аб неабходнасці далучэння язычнікаў да хрысціянскай культуры неаднаразова паўставала ў ранні перыяд існавання Вялікага княства Літоўскага. Нагадаем вядомы факт аб няўдалай спробе вялікага князя Гедыміна ці то хрысціць язычнікаў па каталіцкаму абраду, ці то перавесці ў каталіцызм усё насельніцтва княства. Бясспрэчным доказам надання значнай увагі духоўнаму стану грамадства, імкнення накіраваць яго ў патрэбнае дзяржаве рэчышча з'яўляецца факт асабістага ўдзелу вялікага князя і караля Ягайлы і яго жонкі ў хрышчэнні язычнікаў-балтаў у канцы XIV ст. Зноў жа звернем увагу на тое, што ў гэты час былі ахрышчаны жыхары вёсак Гайна каля Лагойска і Абольцы недалёка ад Талачына, якія доўгія стагоддзі жылі сярод праваслаўных славян.

У канцы XIV ст. пачынаецца працэс, значэнне якога выразна бачыцца праз стагоддзі. Маецца на ўвазе паступовае пашырэнне ўплыву каталіцызму на ўсходнія землі Вялікага княства Літоўскага. Яно адбывалася з ведама і пры падтрымцы дзяржаўнай улады праз своеасаблівае матэрыяльнае заахвочванне найбольш адукаванай, эканамічна і палітычна актыўнай часткі грамадства. Такім чынам, афіцыйная палітыка садзейнічала пачатку паступовага расколу культуры на народную і элітную.

XVI ст. стала пераломным у духоўным жыцці Беларусі. Вызначальнымі прыметамі можна лічыць узнікненне дастаткова ўплывовай рэфармацыйнай плыні ў форме кальвінізму, пашырэнне ідэй Адраджэння з яго пошукамі адказу на пытанне: "Хто ў цэнтры Сусвету — Чалавек ці Бог?" Хаця рэфармацыйныя ідэі закранулі ў асноўным верхнія слаі грамадства, гэта не магло не турбаваць дзяржаўную ўладу і не выклікаць яе адпаведную рэакцыю праз падтрымку контррэфармацыі. У далейшым улада не магла прымірыцца з расколам грамадства на дзве канфесіі з рознай палітычнай арыентацыяй і падтрымала

ініцыятыву стварэння уніяцкай царквы. Такім чынам, дзяржаўная палітыка актыўна ўплывала на духоўнае жыццё грамадства.

З гэтага часу афіцыйная культурная палітыка досыць выразна дэманстравала накіраванасць на ўзмацненне і пашырэнне ўплыву каталіцкай рэлігіі як дзяржаўнай, а праз яе — мовы, духоўнай культуры вярхушкі грамадства на шырокія колы шляхецкага саслоўя. Хацелася б звярнуць увагу, што неафітамі ўспрымалася культура польскай шляхты, г.зн. культура эліты. У выніку ў Беларусі пачала фарміравацца вельмі своеасаблівая, адметная сацыякультурная з'ява, маецца на ўвазе шляхецкая, ці так званая сядзібная культура. З яе існаваннем звязаны значны пласт айчыннай матэрыяльнай і духоўнай культуры, які і па сённяшні дзень зусім мала даследаваны. Гэтая акалічнасць, на наш погляд, прыметна замінае стварэнню цэласнай і аб'ектыўнай карціны развіцця беларускай нацыянальнай культуры. Дарэчы, у Польшчы вывучэнню культуры шляхты надаецца пэўная ўвага, аб чым сведчаць, напрыклад, даследаванні прафесара Я.Тазбіра і інш.

Адной з прычын недастатковага вывучэння культуры беларускай шляхты з'яўляецца захаванне яшчэ ад савецкага перыяду стэрэатыпнасці ў ацэнцы шляхецкай культуры як культуры пануючага класа, чужога па сваім светаўспрыманні і ментальнасці ніжэйшым саслоўям. У сувязі са сказаным можна пагадзіцца з высновамі вядомага даследчыка праблем культуры Б.С.Ерасава, што вылучэнне ў рамках антаганістычнага грамадства дзвюх культур — дэмакратычнай і рэакцыйнай (у нашым выпадку народнай і шляхецкай) — прыводзіць да таго, што функцыянальныя субкультуры, якія звязаны са спецыфічнымі інтарэсамі і ладам жыцця розных класаў, ператвараюцца ў самастойныя і асаблівыя варыянты культуры, а гэта вядзе да тэарэтычнага разрыву культуры ў цэлым [3, с. 256].

Пры аналізе сядзібнай культуры неабходна ўлічваць тую акалічнасць, што яна не магла не адчуваць уздзеяння навакольнага жыцця, сялянскай культуры і па гэтай прычыне не магла заставацца чыста элітнай культурай, хаця і імкнулася да гэтага. Не выпадкова, носьбіт гэтай культуры — дробная шляхта — стаў самым яркім прадстаўніком беларускага Адраджэння канца XIX — пачатку XX ст. Элітная культура панавала ў маёнтках магнатаў. Аснову яе росквіту складалі эканамічныя, палітычныя, адукацыйныя магчымасці і сувязі носьбітаў. Што да дзяржаўнай палітыкі, то яна была зацікаўлена ў падтрымцы і пашырэнні як элітнай, так і ў цэлым шляхецкай культуры, а народная культура, на жаль, была пакінута на волю лёсу.

У выніку пад уплывам дзяржаўнай палітыкі на адной тэрыторыі сфарміраваліся дзве сістэмы каштоўнасцей. У пануючага саслоўя — польская культура і ўтвораная на яе аснове сістэма каштоўнасцей, у нізоў грамадства — свая. У якасці ілюстрацыі да сказанага можна прывесці вельмі слушную заўвагу А.Цвікевіча аб тым, што на працягу апошніх стагоддзяў усё жыццё Беларусі было прасякнута польскай культурай, польскай мовай, усюды панавалі польская кніга і асвета. Не кажучы ўжо аб памешчыцкім двары, як і наогул аб шляхце, нават папоўства і тое да 70—80-х гадоў XIX ст. у Беларусі размаўляла па-польску і жывіла свой погляд польскай навукай і літаратурай [5, с. 189]. На працягу стагоддзяў разрыў і адрозненні паміж гэтымі культурамі і сістэмамі каштоўнасцей станавіліся больш выразнымі, аказвалі ўсё большы ўплыў на сацыяльна-палітычную сітуацыю ў краіне і ў кожным павеце.

Толькі на памежжы XVIII—XIX стст. становяцца прыметнымі першыя спробы збліжэння культур, разумення прадстаўнікамі больш моцнай шляхецкай культуры той сістэмы каштоўнасцей, якая панавала ў сялянскім асяроддзі. Аднак дзяржаўная палітыка ігнаравала відавочны разрыў, маючы на ўвазе толькі свае мэты.

На наш погляд, праблемы, звязаныя з вытокамі і пачаткам беларускага Адраджэння, вельмі разнастайныя і патрабуюць паглыбленага аналізу. Традыцыйна гэты працэс раскрываецца без усебаковага тлумачэння прычын яго ўзнікнення і развіцця ў XIX ст. Па закранутым пытанні аўтар далучаецца да цікавых высноў А.Цвікевіча. Ён лічыў працэс Адраджэння перш за ўсё сацыяльнай з'явай, узнікненне якой па гэтай прычыне не магло быць вынікам чыстай ідэі, а залежала ад шматлікіх умоў, перш за ўсё эканамічных. «Ідэя беларускага культурнага адраджэння, — піша А.Цвікевіч, — лунала ў паветры на працягу ўсяго XIX ст. і, аднак, не набыла рэальнай формы: для гэтага не было адпаведных умоў» [5, с. 187]. Справядлівай з'яўляецца яго заўвага, што ў Беларусі не было шляхецка-дваранскага класа, які ў мінулым заўсёды з'яўляўся носьбітам нацыянальнай ідэі. Ці,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інакш кажучы, ён быў у стане дэнацыяналізаваным, паўпольскім, звязаным адзінай натуральнай сельскай гаспадаркай з Польшчай, таму што складаў з ёй у эканамічным сэнсе адно цэлае. Па чыста аб'ектыўных умовах шляхта не магла пазбыцца сваёй польскасці і вярнуцца ў беларускую нацыянальную стыхію. Трэба прызнаць слушнай выснову А.Цвікевіча аб тым, што Польшча душыла Беларусь сваім зямельным капіталам з такой сілай, што нават Расійская імперыя з усёй грамадай яе дзяржаўных, палітычных і культурных магчымасцей нічога тут не магла зрабіць [5, с. 188].

А.Цвікевіч прыходзіць да прынцыпова важнай высновы, што «польскія ўплывы сур'ёзна парушыліся на Беларусі толькі ў 70-я гады, калі творчыя сілы польскага капіталу сканцэнтраваліся ў карэннай Польшчы і калі там, каля лодзінскіх і варшаўскіх фабрык, пачала вырастаць польская буржуазія» [5, с. 189]. Менавіта тое, што «на працягу цэльнага стагоддзя было не пад сілу імператарскаму расійскаму ўраду, —ператварэнне Беларусі з польскага краю ў край “истинно русский”, — тое бяскроўна і без шуму пачаў рабіць расійскі капітал з яго фабрыкамі, заводамі і канторамі», — піша А.Цвікевіч. І на гэтым пераломе, калі адна эканамічная сіла адступіла, а другая яшчэ не паспела замацавацца «пад вясковай страхой, у шляхецкім засценку, ды ў старасвецкім панскім двары на Беларусі адчулася небяспека. Загастрылася старое, спрадвечнае пытанне: Што значыць ”тутэйшы край” і ”тутэйшы народ”» [5, с. 187].

Добра вядома, што беларускае Адраджэнне пачыналася і развівалася без удзелу дзяржавы. Немагчыма назваць хаця б аднаго з прадстаўнікоў афіцыйных колаў, якія б падтрымлівалі народную культуру і духоўную спадчыну. Заслуга ў яе вывучэнні і пашырэнні звестак аб ёй належыць навукоўцам і нацыянальнай інтэлігенцыі, якая фарміравалася галоўным чынам з дробнай шляхты, маючай цесныя сувязі з сялянскім асяроддзем і яго культурай. Іх дзейнасць і творчасць ў пэўнай ступені аб'яднала ідэя нацыянальнага, культурнага і палітычнага вызначэння беларускага этнасу.

Разам з тым трэба адзначыць і некаторую невыразнасць у раскрыцці праблем другога Адраджэння. У сучаснай навуковай літаратуры адсутнічае комплексны аналіз гэтага перыяду, што не дазваляе ўсебакова адлюстраваць працэсы Адраджэння на мяжы XIX›—XX стст. Без спалучэння і параўнальнага аналізу палажэнняў ідэі краёвасці, ідэі ”западно-руссизма” і дзейнасці іх прадстаўнікоў па пашырэнні культурнага асветніцтва сярод насельніцтва, без далучэння да агульнага палатна культурных працэсаў, што адбываліся сярод іншых народаў, якія жылі побач з беларусамі, мы не зможам атрымаць праўдзівую і выразную карціну культурнага жыцця і афіцыйнай палітыкі ў гэты перыяд.

Увасабленнем зусім новага, нязведанага ў гісторыі стала дзяржаўная культурная палітыка паслярэвалюцыйнага перыяду. Галоўныя характарыстыкі культуры — традыцыя, пераемнасць — былі адкінуты ў імя прызнання так званага класавага характару культуры. Сацыяльна-эканамічны кампанент класавай тэорыі быў перанесены на духоўную сферу і таксама аказаў у значнай ступені негатыўны ўплыў на далейшае развіццё духоўнага і культурнага ладу паслярэвалюцыйнага грамадства. Падаецца, што да месца прыйдзецца заўвага Б.С.Ерасава, якая ўпамінаецца вышэй, аб тэарэтычным разрыве культуры. У савецкі час яна была разарвана і на практыцы.

Савецкая ўлада актыўна шукала новы змест духоўнага жыцця. Партыя бальшавікоў тэарэтычна распрацавала і актыўна прапагандавала ідэю аб існаванні ў грамадстве дзвюх антаганістычных культур — буржуазнай і пралетарскай. Заўважым, што ў гэтай схеме не вызначана месца народнай культуры, пад якой разумеецца этнаграфічная культура, што стваралася на працягу стагоддзяў, перадавалася і захоўвалася з пакалення ў пакаленне. Акрамя песеннай і музычнай спадчыны, яна сфарміравала і захавала цэласную сістэму этычных, маральных і духоўных каштоўнасцей з яе нормамі і правіламі, якія вызначылі змест духоўнага жыцця народа.

Новая партыйная ідэалогія як адна з частак дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры не прымала разважанні аб катэгорыях дабра і зла, злачынстве і непазбежнасці пакарання за яго, аб маральнай адказнасці тых, хто ўзяў на сябе смеласць вучыць астатніх шчасцю, роўнасці, братэрству. У імя нейкай уяўнай мэты ігнараваліся такія абавязкі кожнага разумнага чалавека, як павага да блізкіх, асабістая адказнасць за справу, сціралася гістарычная памяць народа. Месца агульначалавечых шматвяковых духоўных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каштоўнасцей павінна была заняць новая, пралетарская культура, этыка і мараль. «Толькі ідэалогія пралетарыяту можа быць агульначалавечай», — пісаў А.В.Луначарскі [1, с. 4].

Поўны кантроль партыі і дзяржавы над культурай, непамерная яе ідэалагізацыя не садзейнічалі распаўсюджанню нацыянальнай і традыцыйнай культуры. Пры актыўнай падтрымцы дзяржавы ў масах пашыраліся ідэалагічныя міфы аб ліквідацыі эксплуатацыі чалавека чалавекам, аб дзяржаве рабочых і сялян і інш. У новай прапагандысцкай сістэме і ідэалагічнай праграме нівеліраваліся агульначалавечыя і традыцыйныя маральныя каштоўнасці. У сусветнай гісторыі нельга знайсці больш выразнага прыкладу такога маштабнага ўкаранення новай ідэалогіі і культуры ў асяроддзе, якое вызначалася шматвяковымі духоўнымі традыцыямі і культурнымі формамі. Гэта выключная з'ява ў гісторыі, калі за кароткі прамежак часу была штучна створана новая культура, адметная ад нацыянальнай і традыцыйнай, народнай.

Культурная рэвалюцыя, абвешчаная як адзін з кірункаў у пабудове сацыялізму, галоўнай мэтай ставіла ўкараненне "культурнасці" ў шырокія масы. Тым самым прадугледжваліся актыўная палітыка- і культурна-асветніцкая дзейнасць, ліквідацыя непісьменнасці, пачатковая адукацыя, стварэнне "новай" інтэлігенцыі і інш. Усё культурнае жыццё ўлада імкнулася прывесці ў адпаведнасць з тэорыяй марксізму-ленінізму, звязаць з абумоўленай гістарычнай неабходнасцю барацьбы за новае і перадавое. Дзеля гэтага ствараліся заклікі, рытуалы, сімвалы, музеі, выдаваліся творы класікаў марксізму-ленінізму, партыйная і агітацыйная літаратура і інш. Усе кірункі культурнай дзейнасці, культурная спадчына, якія ў чымсьці не адпавядалі афіцыйнай палітыцы, абмяжоўваліся праз устанаўленне дзяржаўнага кантролю.

Сацыякультурная сітуацыя канца XX — пачатку XXI ст. вымагае глыбокага асэнсавання працэсаў, якія адбываюцца ў культуры. З аднаго боку, неабходна абнавіць культурную спадчыну і сістэму духоўнай рэгуляцыі, якія дамінавалі раней, з другога — захаваць усё каштоўнае, перш за ўсё гуманістычны змест культуры папярэдніх стагоддзяў, што павінна забяспечыць найбольш эфектыўны сацыяльна-эканамічны і культурны прагрэс грамадства.

Падсумоўваючы вышэйсказанае, можна заўважыць, што менавіта дзяржава вызначала змест і кірунак культурнай палітыкі адпаведна свайму разуменню задач і мэт, якія стаялі перад грамадствам. У розныя гістарычныя перыяды змест і формы дзяржаўнай культурнай палітыкі мяняліся, аднак мэта яе заставалася нязменнай — гэта шырокае і масавае распаўсюджанне вызначаных кірункаў і засваенне галоўных ідэй і прынцыпаў адпаведнай культурнай палітыкі.


1. *Бюллетень* Всеросийского совещания политпросов.— М.: [Б.и.], 1920.

2. *Джереми Рыфкин* — новый пророк глобализма // Культура в современном мире: опыт, проблемы, решения: Науч.-информ. сб. — М.: Изд.-во РГБ, 2000. — Вып. 3.

3. *Ерасов Б.С.* Социальная культурология.— М.: Аспект-пресс, 1997.

4. *Тарасаў К.* Памяць пра легенды. — Мн.: Беларусь, 1994.

5. *Цьвікевіч А.* «Западно-руссизм»: Нарысы з гісторыі грамадскай мысьлі на Беларусі ў XIX — пач. XX в. — 2-е выд. — Мн.: Навука і тэхніка, 1993. — 352 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ